Ордэн піяраў перажывае Піярскі год пакліканняў

Аўтар: Айцы піяры сумесна з моладдзю
07.09.2012 01:00



2012 год. Колькі прадказанняў было зроблена на гэты год: пачатак ІІІ Сусветнай вайны, поўны крах эканамічнай сістэмы Еўропы, ну, і самае вядомае, – прадказанне племені Майя аб канцы Свету. Заўважылі? Ніводнай пазітыўнай навіны. А вось Ордэн піяраў глядзіць у будучыню з сапраўдным жаданнем і чаканнем. 2012 – гэта ПІЯРСКІ ГОД ПАКЛІКАННЯЎ. У хуткім тэмпе сучаснага жыцця чалавек не можа і не хоча спыніцца, каб паглядзець на свой шлях у паўсядзённасці. Айцы піяры заахвочваюць усіх, а асабліва моладзь, прыслухацца не да свайго эгаістычнага жадання, а да сапраўднага голасу Бога. † Св. Юзаф Каласанс – гэта той, дзякуючы каму з’явіўся Ордэн піяраў. Нарадзіўся ён у Іспаніі. Распазнаўшы ў сабе Божае пакліканне да святарства, стаў святаром. Дыяцэзіяльнае святарства, аднак, не адпавядала яго спадзяванням. Інтуітыўна ён шукаў далей. Пасля абароны доктарскай дысертацыі ў галіне тэалогіі ў 1592 г. Юзаф Каласанс накіраваўся ў Рым. Яго мэтай было атрыманне касцёльнага бенефіцыя. Аднак, здарылася нешта, чаго ён зусім не спадзяваўся... І гэта каардынальна змяніла ўсё яго жыццё. Вандруючы па бедным раёне Рыма, Юзаф сутыкнуўся з сумным лёсам дзяцей, якія не мелі магчымасці вучыцца і лічыліся адкідамі грамадства. Юзаф вырашыў не вяртацца ў Іспанію, а прысвяціць сябе гэтым дзецям. Такім чынам, Каласанс распазнае сваё новае пакліканне – настаўніка і выхавацеля. Сваім блізкім на радзіме Юзаф Каласанс піша з унутраным спакоем: “Тут, у Рыме, я знайшоў найлепшы спосаб служэння Богу і людзям. І нішто на свеце не прымусіць мяне адмовіцца ад гэтага...”.

Ордэн піяраў перажывае Піярскі год паклікання

Аўтар: Айцы піяры сумесна з моладдзю
07.09.2012 01:00

